Паўлава С.А.,
дацэнт

## РОЛЯ КУРСАЎ ПА ВЫБАРУ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ НА ФАКУЛЬТЭЦЕ БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНЫХ СІСТЭМ

Канчатковая мэта перабудовы структуры прафесійнай адукацыі - гэта пабудова сістэмы, якая б дазволіла ВНУ мабільна і гібка змяняць структуру падрыхтоўкі кадраў з улікам змен на рынку працы. Пераход да шматузроўневай сістэмы адукацыі аблегчыць вырашэнне праблем навучання і выжывання. Разам з тым гэта сістэма дасць магчымасць весці падрыхтоўку бібліятэчных работнікаў з розным аб'ёмам і глыбінёй навучання. І вось тут асобнае месца ў змесце навучання павінны заняць курсы па выбару.

Праблема прафесійнай падрыхтоўкі бібліятэкараў глыбока хвалюе кадры факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм. Таму ўкараненне курсаў па выбару з'яўляецца накірункам актуалізацыі і ўдасканалення прыкладных ведаў і практычных уменняў студэнтаў як будучых спецыялістаў.

На факультэце маецца станоўчы вопыт укаранення курсаў па выбару ў навучальны працэс. Сёння наша задача - удасканаленне гэтай дзейнасці і ў бліжэйшай перспектыве распрацоўка структуры курсаў у адпаведнасці з узроўнямі адукацыі.

Агульнай рысай курсаў па выбару з'яўляецца паглыбленне тэарэтычных ведаў, набыццё практычных уменняў і навыкаў у галіне сучаснай бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. Курсы па выбару даюць магчымасць выкладчыкам аператыўна адлюстроўваць усе канцэптуальныя тэарэтыка-метадалагічныя, арганізацыйныя і тэхналагічныя з'явы тэорыі і практыкі.

На падставе напрацаванага вопыту па арганізацыі і правядзенні курсаў па выбару можна вылучыць іх агульныя структурныя і функцыянальныя характарыстыкі.

1. Лагічная і сістэмная сувязь з агульнапрафесійнымі і спецыяльнымі дысцыплінамі.

2. Комплекснасць адлюстравання аб'екта.

3. Паглыбленае вывучэнне тэарэтычных і прыкладных асаблівасцей будучай прафесіі.

4. Курсы па выбару даюць магчымасць выкладчыкам выкарыстоўваць асабістыя навуковыя пошукі. На гэтай падставе даюцца асновы фарміравання навуковай школы. Студэнты далучаюцца да навуковай дзейнасці.

5. У курсах па выбару надзвычай удала рэалізуюцца сувязі між кафедрамі, што адпавядае інтэграцыйнаму характару дзейнасці па шэрагу бібліятэчна-інфармацыйных працэсаў.

6. Адзначаныя формы навучання ўзвышаюць прэстыж бібліятэчнай прафесіі, аказваюць станоўчы ўплыў на фарміраванне прафесійных рыс будучых спецыялістаў.

Па тэматычнай накіраванасці ўжо сёння яны вельмі разнастайныя. Па-першае, гэта адлюстраванне актуальных праблем бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці, звязаных з працэсам нацыянальнага адраджэння. Па-другое, падрыхтоўка кіраўнікоў бібліятэк, аддзелаў, спецыфіка работы ў бібліятэках розных тыпаў, маркетынгавы падыход у кіраванні рэалізуюцца таксама праз курсы па выбару. Па-трэцяе, удасканаленне прафесійнага навучання бібліятэкараў у ВНУ патрабуе ўзмацнення псіхалагічнай падрыхтоўкі студэнтаў і набыцця імі навыкаў, ведаў з улікам задач бібліятэчнай практыкі. Гэта магчыма рэалізаваць у працэсе арганізацыі курсаў па выбару. І яшчэ адзін накірунак - аўтаматызацыя бібліятэчна-інфармацыйных працэсаў.

Сёння выкладчыкі факультэта ўносяць свае прапановы ў новыя вучэбныя планы па асобных спецыялізацыях. Зроблены першыя крокі пераходу на шматузроўневую сістэму адукацыі: гэта набор навучэнцаў пасля заканчэння тэхнікума, стварэнне каледжа пры лінгвагуманітарным комплексе на базе СШ N 24 г.Мінска. У структуры вучэбных планаў закладзены прынцыпы абавязковасці і выбіральнасці.

Канцэпцыя развіцця бібліятэчнай справы ў нашай рэспубліцы, Закон аб культуры з'явіліся падставай увядзення новых курсаў па выбару. Таксама трэба адзначыць першыя крокі ў высвятленні меркаванняў студэнтаў аб тых курсах па выбару, якія ім чыталіся ў гэтым навучальным годзе і якія мэтазгодна ўвесці новыя.

Стрыжонак І.М.,
ст.выкладчык

## АСАБЛІВАСЦІ ПРАФЕСІЙНАЙ АРЫЕНТАЦЫІ БУДУЧЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ

Універсітэт дае будучаму спецыялісту не толькі прафесійныя веды і ўменні, але і фарміруе яго адносіны да сваёй будучай справы, дапамагае разумець яе задачы і значнасць, выхоўвае прафесійную гордасць і любоў да сваёй работы. Прафарыентацыя асобы прадугледжвае матыў выбару спецыяльнасці як сфарміраваны інтарэс да дакладнай прафесіі, ацэнку яе сацыяльнага прэстыжу, установку асобы на авалоданне гэтай прафесіяй і ў адпаведнасці з гэтым пабудову

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яе жыццёвых планаў. Ва ўмовах універсітэта прафарыентацыя арганічна зліваецца з вучэбна-выхаваўчым працэсам, мае сваю спецыфіку, задачы і формы работы. Яе асаблівасцямі з'яўляюцца, па-першае, тое, што прафарыентацыя не вядзе да выбару прафесіі асобай, бо гэта ўжо рэалізавалася ў паступленні ва універсітэт; па-другое, прафарыентацыя ва універсітэце прадугледжвае асваенне кожным студэнтам будучай дзейнасці, і па форме ўздзеяння яна арыентуецца на найбольш цікавыя для студэнтаў фактары збранай спецыяльнасці: творчыя магчымасці, месца прафесіі ў жыцці грамадства, яе прэстыж.

Ва універсітэце культуры для прафарыентацыі выкарыстоўваюцца розныя формы групавых індывідуальных заняткаў, масавыя мерапрыемствы (сустрэчы з цікавымі людзьмі - прадстаўнікамі сваёй прафесіі, «пасвячэнне ў студэнты», правядзенне цыкла лекцый для першакурснікаў аб будучай спецыяльнасці і інш.). Выкладчыкі знаёмяць студэнтаў са зместам працэсу навучання, з узроўнем патрабаванняў і крытэрыямі ацэнкі іх ведаў, навыкаў пры праверцы, што садзейнічае асэнсаванаму навучанню, арыентаванасці на спецыяльнасць, сродкі і шляхі яе атрымання. Прафарыентацыя ажыццяўляецца з выкарыстаннем стымулаў на ўсіх узроўнях, з улікам далёкага матыву сацыяльна карыснай дзейнасці асобы ў будучым. На фоне гэтага матыву выступаюць асабістыя матывы: атрыманне ведаў і дыплома, перавод на наступны курс, поспехі на іспытах і заліках. Кіраваць прафарыентацыяй студэнта - гэта правільна каардынаваць суадносіны стымулаў і мэт асобы.

Такім чынам, прафарыентацыя спецыяліста працягваецца ва універсітэце ў параўнанні са школай, каледжам на новым, больш высокім узроўні. Каб забяспечыць аптымізацыю дзейнасці ўсёй сістэмы прафарыентацыі, неабходны даследаванні на розных яе этапах, выкарыстанне розных формаў, метадаў:

- арганізацыя ўпарадкаванай праверкі матывацыйных установак абітурыентаў, якія выбіраюць прафесію;
- вывучэнне працэсу адаптацыі студэнтаў 1 - 2 курсаў да ўмоў навучання ва універсітэце ў аспекце ажыццяўляемых задач прафарыентацыі;
- выкарыстанне новых формаў і метадаў у рабоце па прафарыентацыі, напрыклад складанне прафесіяграм спецыяльнасцей, у якіх утрымліваюцца звесткі аб ролі спецыяльнасці, перспектывах яе развіцця, сацыяльна-эканамічным значэнні (было б добра даць кожнаму студэнту першага курса надрукаваную памятку аб выбранай спецыяльнасці, дзе скарочана выкладаецца прафесіяграма);
- праверка прафарыентацыі студэнтаў-дыпломнікаў (патрэбна распрацаваць рэкамендацыі па ўздзеянню на студэнта з боку кіраўніка дыпломнай работы);
- арганізацыя прафесійнага кантролю за дзейнасцю выпускнікоў.

Усё гэта забяспечыць спалучэнне інтарэсаў студэнтаў, іх актыўнай дзейнасці па авалоданню ведамі і інтарэсаў універсітэта па падрыхтоўцы і выпуску высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Фядорына А.І.,
ст.выкладчык

## УДАСКАНАЛЕННЕ СІСТЭМЫ МАШЫННАЙ ПРАВЕРКІ ВЕДАЎ СТУДЭНТАЎ ПА КУРСУ «АНАЛІТЫКА-СІНТЭТЫЧНАЯ АПРАЦОЎКА ДАКУМЕНТАЎ»

Глыбокія і моцныя веды студэнтаў - адна з галоўных мэт дзейнасці любой ВНУ. У яе дасягненні вялікую ролю адыгрывае арганізацыя самастойнай работы студэнтаў. Такая работа можа быць у тым выпадку, калі студэнты ўцягнуты ў актыўны пазнавальны працэс. Для вырашэння гэтай задачы прапануюцца розныя арганізацыйныя, дыдактычныя і выхаваўчыя сродкі. У іх ліку важным з'яўляецца аб'ектыўная і сістэматычная праверка ведаў студэнтаў. У гэтым выпадку вялікімі магчымасцямі валодаюць навучальныя і кантралюючыя машыны.

Не выпадкова, што многія вышэйшыя навучальныя ўстановы ўжо выкарыстоўваюць у гэтых мэтах ЭВМ. Разам з тым, здаецца, яшчэ доўгі час магчымасці скарыстання камп'ютэраў для гуманітарных невялікіх вышэйшых навучальных устаноў будуць абмежаванымі. Таму шмат ВНУ рэспублікі, у тым ліку і Беларускі універсітэт культуры, набываюць простыя, недарагія машыны тыпу «КІСІ-5», «Аганёк» і інш.

Намі зроблена спроба даследаваць праблему эфектыўнасці праверкі ведаў студэнтаў кантралюючымі ўстройствамі тыпу «Аганёк».

Даследаванне прадугледжвала наступныя мэты: 1) праверыць колькасць разыходжанняў у ацэнцы ведаў студэнтаў машынай і ў выніку вуснага апытання; 2) выявіць псіхалагічныя працэсы ў студэнтаў ва ўмовах машыннай праверкі іх ведаў, а таксама адносіны апошніх да самой праверкі; 3) выявіць колькасць разыходжанняў паміж суб'ектыўнай ацэнкай сваіх ведаў студэнтамі і ацэнкай гэтых ведаў машынай; 4) вызначыць адрозненні ў прадукцыйнасці працы пры машыннай і вуснай праверцы ведаў студэнтаў.